# Легенды зямлі слаўгарадскай

**На зямлі Магілёўскай на беразе ракі Проня, дзе яна ўпадае ў магутны Сож, ёсць невялікае мястэчка - Слаўгарад. А каля яго - таямніча- рамантычная Блакітная крыніца, або Сіні калодзеж - гідралагічны помнік прыроды рэспубліканскага значэння з гаючай вадой і дзівоснымі легендамі. А колькі цікавага ў самім горадзе!..**

**Сіні калодзеж**

Знаходзіцца ён у некалькіх кіламетрах ад Слаўга- рада. З даўніх часоў тэта месца лічылася сакральным і выкарыстоўвалася як паганскае капішча, дзе радзімічы пакланяліся сонцу і сілам нябесным. Нават пасля гвалтоўнага пераходу ў хрысціянства людзі не пакінулі сваёй веры ў цуды. Кажуць, што Блакітная крыніца адной з першых на тэрыторыі Беларусі стала святой.

**Дабрацца да Блакітнай крыніцы можна на аўто: з мая па кастрычнік па кароткай дарозе - праз пантонны мост, з лістапада на красавік - па «грунтоўцы» ад Краснаполля.**

Паданняў пра яе складзена мноства: пра Русалку, якая блукала каля калодзежа, пра тапельніцу Проню... Самая цікавая легенда, запісаная вядомым магілёўскім краязнаўцам Е. Р. Раманавым у 1891 годзе, распавядае пра жанчыну-асілка Кацярыну і двух закаханых у яе веліканаў - Сцяпана і Марка. Каб адмовіць нялюбаму Марку, дзяўчына зладзіла паміж імі спаборніцтва — кіданне вялізных валуноў. Каханаму Сцяпану дастаўся камень велічынёй са стол, а Марку - з печ. Кінулі хлопцы свае камяні і пайшлі глядзець, чый дзе аказаўся.

Выйшла так, што камень Сцяпана ўпаў бліжэй. Тады Кацярына ступіла на Сцяпанаў камень і кажа: «Чым дастацца нялюбаму, пайду людзям лепш вадой служыць». Кінулася яна з валуна і разлілася вадой, а на ім з таго часу застаўся яе след... І цяпер ляжыць Сцяпанаў камень побач з Сінім калодзежам, а ў лесе можназнайсці Маркаў камень.

**Волат Кацярына сустракаецца і ў іншых паданнях як старажытнае жаночае бажаство зямлі, вады і жыцця, тым часам як Сцяпан - празрыстая адсылка да вобраза бога лясоў, звяроў і чараўніцтва Велеса.**

Па напрамку руху падземных водаў тэта крыніца ўзыходзячага тыпу з адной з самых модных плынь на Усходне-Еўрапейскай раўніне. У старажытныя часы, кажуць, ключ біў у вышыню на некалькі метраў, нібы фантан. Толькі ўявіце - 60 л у секунду! І гэта з глыбіні 200 м!

А выглядае крыніца як невялікае малочна-бірузовае возера ў аправе ліставых дрэў. Даўжыня яго - 25 м, шырыня - 10-12 м. У паўночна-заходняй яго частцы, каля берагавой лініі, на глыбіні 2,5 м была знойдзена вертыкальная «шахта» дыяметрам 1,4 м, па якой трапляюць на паверхню падземныя воды. Сценкі яе складзены з мергеля, дзякуючы яму вада ў возсры і набыла малочнае адценне.

З гэтай крынічнай ванны бярэ пачатак імклівы ручай Галуба з ледзяной да ламаты ў костках - круглы год каля +5-7 °С - вадой блакітна-смарагдавага колеру. У яе складзе шмат фтору, крэмнія, срэбра, таму яна належыць да гідракарбанатнага класа кальцыевай трупы (агульная мінералізацыя - каля 180 мг/л).

**На дне крыніцы знаходзіцца белая гліна. Многія лічаць яе гаючай і імкнуцца намазацца або набраць дадому. Тым часам за такія маніпуляцыі прадугледжана крымінальная адказнасць, бо здабыча гліны наносіць сур’ёзную шкоду помніку нрыроды.**

Значная плошча дна азярца пакрытая ніткаватымі водарасцямі, на якіх у 2008 годзе была знойдзена калонія пурпуровых бактэрый. Асобнымі курцінамі расце ўрэчнік вастралісты. З беспазваночі іых у крыніцы і

ручаі ёсць сапраўдныя шыцікі, аўсянікі і іх лічынкі.

Берагі зараслі драўняна-хмызняковай расліннасцю, пераважна вербалозам і вольхай. Сустракаюцца таксамі дубы, ліпы, ляшчына. Жывуць ластаўкі-берагавушкі, зімой можна ўбачыць дзікіх качак.

Побач з Блакітнай крыніцай пабудавана невялікая Свята-Макавееўская часоўня, дзе 14 жніўня на праваслаўнае свята Макавей праводзядца малебны. У гэты час тут збіраецца да 20 тыс. паломнікаў. Устаноўлены крыжы, падстаўкі з пяском для свечак. Ёсць спецыяльна абсталяванае месца для жадаючых акунуцца.

### Замкавая гара

На высокім і абрывістым правым беразе Сожа, каля вусця рэчкі Проня, на тэрыторыі сучаснага слаўгарадскага парка знаходзіцца старажытнае гарадзішча Прупой (на мясцовым дыялекце «прупой» - модны вір пры злучэнні рэк, у прыватнасці Проні з Сожам). Гэта пляцоўка 40 х 95 м, выцягнутая з поўдня на поўнач. Вышыня яе над ўзроўнем ракі Сож - каля 30 м, глыбіня рова - 11 м. Адсюль і пачаў свой шлях Прапойск (так раней, да 1945 года, называўся Слаўгарад).

**На Замкавай гары ў 1968, 1974 і 1988 гадах праводзіліся археалагічныя раскопкі. Былі атрыманы знаходкі эпохі неаліта, жалезнага веку, Кіеўскай Русі: элементы керамікі, шкляныя бранзалеты, драўляны частакол і інш.**

Першая згадка ў летапісах аб паселішчы датавана 1136 годам. Калі яно ў 1197 было далучана князем Мсціславам Раманавічам да Смаленскага княства, тут ужо быў добра ўмацаваны замак. У 1359 годзе Прапойск увайшоў у склад Вялікага Княства Літоўскага. У 1607 годзе ў горадзе схапілі Ілжэдзмітрыя II, у 1708 — падчас Паўночнай вайны (1700-1721) у гэтых мясцінах адбылася буйная бітва рускіх войскаў са шведамі. У 1772 годзе паселішча ўвайшло ў Расійскую імперыю. Кацярына II падаравала яго князю А. М. Галідыну. Замак яшчэ існаваў, але быў у даволі кепскім стане.

Каб годна сустрэдь імператрыцу, князь у кароткі тэрмін дабудаваў да замка двухпавярховы драўляны палац. Крыху пазней Галіцын заняўся перапланіроўкай гары, знішчыў некаторыя абарончыя валы і рэшткі старажытнага ўмацавання. Пасля 1917 года ў княжацкай сядзібе знаходзілася камуна, але да 1930 будынак так струхлеў, што яго знеслі.

Да нашых дзён захаваліся толькі равы і валы XII стагоддзя. На поўнач ад гарадзішча прасочваюцца сляды неўмацаванага насада. Пасля чарговага агалення схілу адкрыўся падземны ход на вышыні 25 м ад урэзу вады, вы- кладзены з чырвонай цэглы.

Можна на Замкавай гары яшчэ прагуляцца на алеях прыгожага

**Водныя гандлёвыя шляхі, што ішлі праз горад, мелі вялікае стратэгічнае значэнне для яго развіцця. Дарэчы, аб тым, што Прапойск быў партовым, да 2005 года сведчыў якар на гербе. Зараз на ім залаты помнік, прысвечаны нерамозе рускіх войскаў у 1708 годзе над шведамі каля вёскі Лясная.**

старажытнага парку, закладзенага князем А. М. Галіцыным, дзе лунае дух шматвяковай гісторыі, і па-любавацца маляўнічым відам на месца зліцця Сожа і Проні. На поўдзень ад цэнтральнага ўваходу ў парк, на заходнім схіле яра пад Замкавай тарой, знаходзіцца невялікая крыніца. З вуліцы Ленінскай да яе вядзе драўляная лесвіца. Над крыпіцай збудавана каплічка.

**У XIX стагоддзі на старым Варшаўскім шасэ была пабудавана паштовая станцыя (зараз у ёй мясцовы краязнаўчы музей): сціплы аднапавярховы будынак з вялікім унутраным дваром і каменнай агароджай. Вокны і парадныя дзверы аформлены ў неагатычным стылі. Паводле гарадской легенды, тут у 1820 і 1824 гадах спыняўся А. С. Пушкін, аднак будынак адчынілі ўжо пасля яго смерці.**

### Храм Нараджэння Прасвятой Багародзіцы

Пабудаваны ў 1791-1793 гадах пры князе А. М. Галіцыне ў класічным стылі, пра што сведчыць яго ансамбль з

васьміграннным купалам і званіцай. На ўзвядзенне былі запрошаны вядомыя ў тыя часы майстры - муляр Лука Іваноў і рускі архітэктар Мікалай Львоў. Усе будаўнічыя матэрыялы, акрамя жалеза на дах, выраблялісяў самім горадзе.

Інтэр’ер храма Нараджэння Прасвятой Багародзіцы быў упрыгожаны іканастасам, жывапісам і цудоўнымі фрэскамі, у якіх першапачаткова налічвалася 57 сюжэтаў са .Старога і Новага Запаветаў. У роспісе бралі ўдзел лепшыя маскоўскія мастакі. Сярод іх быў і Уладзімір Лукіч Баравікоўскі - акадэмік Імператарскай Акадэміі мастацтваў у Санкт-Пецярбурзе, аўтар партрэгаў Кацярыны II, Паўла I і многіх іншых высокапастаўленых асоб Расійскай імперыі. На жаль, на сёння большая частка роспісаў знаходзіцца пад пластом тынкоўкі. А тыя фрэскі, якія яшчэ можна ўбачыць на сценах царквы, тэрмінова патрабуюць рэстаўрацыі.

Побач з храмам была зроблена невялікая званіца, гаспадарчыя пабудовы і царкоўна-прыходская школа. У час атэістычных ганенняў царква была зачынена і выкарыстоўвалася як дапаможнае памяшканне прыстані. Бязлітасна з ім абыйшлася і Вялікая Айчынная вайна.

### Насуперак Чарнобылю

Тутэйшую зямлю можна смела назваць шматпакутнай. Яшчэ не так даўно побач з Сінім калодзежам была вёска Кліны, жыхары якой карысталіся выключна крынічнай вадой, ды толькі іх тэта не моцна выратавала. Адбылася Чарнобыльская катастрофа, і цуду не здарылася: вёску адсялілі, а дамы пахавалі, зраўнялі з зямлёй, і следу зараз не знойдзеш.

А вось на гаючых уласцівасцях вады Блакітнай крыніцы радыяцыя ніяк не адбілася. Гаворка пра гэта разнеслася далёка за межы нашай краіны. І людзі едуць і едуць сюды з верай, што да чалавека, які тройчы пяройдзе Сіні калодзеж, здароўе будзе добрым, а жыццё доўгім. Так і Слаўгарад, які абмываецца водамі дзвюх рэк, нягледзячы на ўсе войны, разбурэнні, Чарнобыльскую катастрофу, з кожным днём становіцца толькі прыгажэйшым.